# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

31 снежня 2024 г. № 483 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае ўмацаванню духоўных каштоўнасцей і маральных традыцый беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню моладзі, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2024 года:

калектыву дзяржаўнай установы ”Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі“ – за выдатныя дасягненні ў паляпшэнні якасці медыцынскай дапамогі, развіццё навукі і папулярызацыю ідэй дабрачыннасці і міласэрнасці;

калектыву ўстановы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў“ – за актыўную дзейнасць у патрыятычным выхаванні моладзі, рэалізацыю грамадска-патрыятычнага праекта ”Лінія памяці. Код вайны“;

протаіерэю Кунцэвічу Алегу Аляксандравічу, настаяцелю рэлігійнай абшчыны ”Прыход храма Узнясення Крыжа Гасподняга ў г.Мінску Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы“, – за вялікі асабісты ўклад у справу духоўнай асветы і патрыятычнае выхаванне, увекавечванне памяці аб загінулых у фашысцкім лагеры смерці для савецкіх ваеннапалонных ”Шталаг 352“.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2024 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10